## Нагрудны знак адзнакі органаў дыпламатычнай службы Рэспублікі Беларусь

Нагрудны знак адзнакі органаў дыпламатычнай службы **«За заслугі ў дыпламатычнай службе»** мае две ступені. Нагрудны знак уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубного крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі залацістага (серабрыстага) колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

Усе элементы крыжа абрамлены кантам залацістага (серабрыстага) колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь залацістага (серабрыстага) колеру.

Нагрудны знак пры дапамозе вушка і кольца злучаецца з вертыкальнай прамавугольнай калодкай залацістага (серабрыстага) колеру, на якой размешчана стужка сіняга колеру з чырвонай паласой у цэнтры і чырвонай аблямоўкай па краях. У цэнтры чырвонай паласы – беларускі арнамент залацістага (серабрыстага) колеру.

Нагрудны знак адзнакі органаў дыпламатычнай службы **«Партнёрства»** уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубного крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі залацістага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

Усе элементы крыжа абрамлены кантам залацістага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь залацістага колеру. Крыж размешчаны на чатырохпрамянёвай зорцы залацістага колеру.